Хорошо характеризуют повседневность 1920-х гг. частные объявления. Жители размещали объявления о покупке «старинных русских редких монет», продаже рояля, покупке каракулевого пальто, поиске хорошей пишущей машинки, работы, квартиры, потере вещей и проч. [1, д. 87, л. 13 об., л. 45 об.]. В декабре 1922 г. при проезде по городу был утерян брезентовый портфель.«Все утерянное никакой ценности для нашедшего не представляет, но весьма ценно для учреждения. Представившему портфель с упомянутыми документами будет выдано мною вознаграждение», – взывал к совести и карману граждан незадачливый автор объявления [1, д. 87, л. 30 об.]. Рассеянным (?) совслужащим в 3,5 дня с извозчика был уронен портфель с деньгами (465 тыс. совзнаками). Их просили вернуть за приличное вознаграждение. В объявлении подчеркивалось крупными буквами, что «ДЕНЬГИ – КАЗЕННЫЕ» [1, д. 93, л. 95 об.]. В 1923 г. нашедшего 1 апреля, вечером, по Смоленской улице дамскую сумочку с документами, убедительно просили «доставить документы в редакцию для В.Г. ЗА ВОЗНАГРАЖДЕНИЕ» [1, д. 91, л. 6 об.]. Проживали в городе и любители элитных пород собак. 27 февраля 1929 г. в «Заре Запада» было опубликовано следующее объявление: «Пропал молодой понтер. Ноги и грудь белые; голова и спина – темно-коричневые с белым треугольником. Утайку преследую по закону. Просьба сообщить: Песковатинская Набережная, д. 6., Халютин» [1, д. 95, л. 20 об.]. Хозяин явно предполагал кражу, отсюда – «Утайку преследую по закону».

Таким образом, реклама и объявления витебских газет 1920-х гг. показывают, что с окончанием гражданской войны, повседневная жизнь обывателя входила в относительно спокойное русло и потекла своим чередом. Потребность в музыке, потеря любимой собаки, попытки решить проблемы быта, найти работу или снять жилье – эти атрибуты будничной жизни человека были не только отзвуками прошлой эпохи, но и реальностью 1920-х гг. Осталась неистребимой страсть к азарту, с которым тогда еще мирилась власть: конские бега, грандиозные лотереи-аллегри, карточные клубы. Однако усиливалось влияние идеологии на повседневную жизнь людей. Партийные, комсомольские, профсоюзные организации приглашали жителей Витебска на многочисленные политсуды, лекции или дискуссии по новому быту, конференции, собрания и заседания и т.д. Что касается самой рекламы, то самой массированной и агрессивной (в тех формах, какие были доступны) была реклама спиртных и табачных изделий.Такой же была и реклама кино, которое и тогда в основном было зарубежным и развлекательным. Производители в рекламе всегда указывали предыдущее название предприятия или его бывшего владельца, как гарантию качества и узнаваемый, говоря сегодняшним языком, бренд.

1. Государственный архив Витебской области (ГАВО). – Ф. 2289. Оп. 2. Д. 74.

2. Рынков, В. Периодическая печать: место в системе исторических источников // [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://polit.ru/article/2010/08/09/periodika/. – Дата доступа: 31.08.2015.

**Казак Т.В.**

## ГАРАДСКАЯ ГАЗЕТА ЯК КРЫНІЦА ПА ВЫВУЧЭННІ ШТОДЗЁННАГА ЖЫЦЦЯ ГАРАДЖАН (НА ПРЫКЛАДЗЕ ПОЛЬСКАГА ПЕРЫЯДЫЧНАГА ДРУКУ ГРОДНА 1919–1939 гг.)

Гродна ў міжваенны час аказаўся ў складзе польскай дзяржавы, дзе самым разпаўсюджаным сродкам масавай інфармацыі заставаўся перыядычны друк. У 1919–1939 гг. у горадзе выдавалася 76 назваў розных выданняў. Друкаваліся яны на польскай, ідыш, беларускай і рускай мовах, з іх 60 выданняў на польскай мове.

У міжваенны час Гродна было досыць вялікім выдавецкім асяродкам у Беластоцкім ваяводстве. Па падліках Анджэя Наткоўскага ў ваяводстве выходзіла 51 штодзённая газета, 29 былі філіямі, з іх у Беластоку 20 (14 філій), у Гродне – 21 выданне (10 філій) [4, с. 146–147]. Калі параўнаем Беласток, які меў на 36 тыс. жыхароў больш чым Гродна [2, с. 76]., то прыходзіць выснова пра вялікае значэнне Гродна як выдавецкага асяродка. Гродзенскія выданні, як і ва ўсёй Польшчы, друкавалі матэрыялы агульнапольскага характару. Важным для развіцця правінцыйнай ці рэгіянальнай прэсы* міжваеннага часу з'яўляліся мутацыі, такім тэрмінам па-

* Для вызначэння правінцыйнай ці рэгіянальнай прэсы міжваеннага часа карыстаюся тэрытарыяльным фактарам, паводле якога Наткоўскі разумее выданні, якія выходзілі і рэдагаваліся па-за Варшавай і вялікімі гарадамі (Лодзь, Вільня, Познань, Катавіцы, Кракаў і Львоў) [4, с. 7].



Репозиторий ВГУ

значаюць газеты і часопісы, якія былі копіяй галоўных выданняў з іншых, часцей за ўсё вялікіх, гарадоў. Мутацыі вельмі часта выходзілі ў правінцыі [4, с. 13]. Аднак, такія выданні акрамя перадрукаў агульных навінаў дэманстравалі мясцовыя навіны з “шырокаабсяжнай ваколіцы”. Таксама можна дапусціць, што прэса была папулярнай і чыталася, але пра наклады мала вядома (часам пішуць пра некаторыя выданні і тут вельмі розныя лічбы ад 800 экзэмпляраў да 10 тысяч).

Гродзенскія газеты ў 1919–1939 гг. мелі розны характар, найбольш папулярныя былі агульнаінфармацыйныя, але таксама вайсковыя, палітычна-інфармацыйныя, рэлігійныя, моладзевыя, сельска-гаспадарчыя, спецыялізаваныя, педагагічныя і сацыяльна-культурныя. У змесце гэтых выданняў шмат інфармацыі, якая адлюстроўвае штодзённае жыццё гараджан.

Змест гродзенскіх газет не вельмі адрозніўся ад іншых выданняў на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства. На першых старонках амаль кожнага выдання размяшчалася інфармацыя агульнадзяржаўнага і сусветнага значэння, асабліва гэта было бачна ў мутацыях. Рэдка тут можна было ўбачыць артыкулы, прысвечаныя мясцовай тэматыцы. Выключэннем была газета *Mały dziennik grodzieński*, якая друкавала навіны з Гродна на першай старонцы.

Жыццё горада на старонках газеты было прадстаўлена ў выглядзе розных рубрык ці раздзелаў. Найбольш папулярнымі былі:

1. Рубрыка рэгіянальных і гарадскіх навінаў, выходзіла пад такімі назвамі як “Kronika” (Хроніка) у газетах *Kurjer Grodzieński, Nowy dziennik kresowy*, “Miejscowe” (Гарадское) у *Przegląd Tygodniowy*, “Życie społeczne” (Грамадскае жыццё) у *Gazeta Polska Ziemi Grodzieńskiej*, „Co słychać w Rzeczypospoltej Grodzieńskiej” (Што чуваць у Гродзенскай Рэчы Паспалітай) у *Czyn młodych*, „Z podwórka grodzieńskiego” (З гродзенскага падворка) у *Czyn młodych*, „Tydzień w życiu Grodna” (Тыдзень у жыцці Гродна) у *Nad Niemnem*. Гэтая рубрыка часта ўключала акрамя навінаў яшчэ прагноз надвор’я, начныя дзяжурствы аптэкаў.

2. Рубрыка навінаў культуры (найбольш інфармацыі пра тэатральнае жыццё): “Z teatru miejskiego” (З гарадскога тэтра), „Widowiska” (Мерапрыемствы); і спорту - “Z ruchu sportowego” (З спартыўнага руху). Культурнае жыццё горада было сканцэнтравана вакол двух тэатраў – Гарадскога тэатра імя Элізы Ажэшкі і гарнізоннага тэатра. Першы меў нават сваё выданне, якое выходзіла ў тэатральным сезоне 1937–1938 гг. пад назвай *Nasza Scena*. Яно выдавалася як дадатак да праграмы спектакля, і ўтрымлівала артыкулы з тэатральнай крытыкай і з гісторыяй тэатраў Гродна. Гарнізоны тэатр быў вайсковым, таму яго папулярызавалі на старонках выдання *Reduta*, якое выдавалася вайскоўцамі у Вільні, а пазней у Гродна.

3. Крымінальныя навіны размяшчаліся ў “Kronika policyjna” (Паліцэйская хроніка), “Z Sali sądowej” (З судовай залі).

4. У асобнай рубрыцы размяшчаліся лісты ад чытачоў, што сведчыць аб важным іх значэнні для рэдакцыі, называліся – “Nadesłane” (Дасланае), “List do Redakcji” (Лісты ў рэдакцыю). Сярод атрыманай пошты вылучаліся лісты з рэгіёна – “Z prowincji” (З правінцыі), “Z Kresów” (З Крэсаў), “Wieści i obrazki z kraju” (Навіны і малюнкі з края), “Odgłosy z prowincji” (Водгукі з правінцыі), а таксама з асобных мястэчак і гарадоў – Крынак, Парэчча, Індуры, Лунна, Ваўкавыска, Супрасля, Саколкі, Гайнаўкі і інш.

5. У нешматлікіх выданнях былі рубрыкі з фельетонамі на гродзенскія тэмы пра праблемы горада пад такімі назвамі як “Obrazki Grodzieńskie” (Гродзенскія малюнкі) у *Nowy dziennik kresowy*, “Z mojego okna” (З майго вакна) у *Trybuna* і інш.

6. У некаторых газетах была асобная рубрыка з рашэннямі Гарадской рады (магістрата) пад назвай “Dział urzędowy” (Урадавы аддзел) у *Kurier Grodzieński*, *Nadniemeński Kurier Polski.*

Шмат месца на старонках газет ўдзялялася жыццю і творчасці вядомым асобаў ці святкаванню дзяржаўных святаў. Шырока вядомай постацю для міжваеннага Гродна была пісьменніца і грамадскі дзеяч – Эліза Ажэшка, якой прысвячалася шмат увагі на старонках польскіх газет, часцей за ўсё ў сувязі з гадавінамі (нараджэння ці смерці). У кожнай польскай газеце на працягу года выходзіла некалькі артыкулаў пра дзейнасць мясцовага Таварыства імя Э.Ажэшкі. Хаця даследчыкі лічаць, што яна не стала для гродзенцаў сімвалам горада ў міжваенны час [3, с. 464]. Больш важнай асобай для фарміравання вобраза горада, якой надавалася вялікае значэнне, стаў кароль Стэфан Баторы, чаму паспрыяла святкаванне 400-годдзя з дня яго нараджэння і 350-годдзя з дня смерці. Пра падрыхтоўку і ўрачыстаці з нагоды гэтых святаў інфармацыя таксама прадстаўлена на старонках польскіх газет [1].



Рэпазіторый ВДУ

Тэматыкай артыкулаў былі не толькі навіны, а таксама аналіз дзяржаўных і мясцовых падзей. Вельмі часта друкаваліся краязнаўчыя артыкулы, у якіх можна ўбачыць рэгіянальныя асаблівасці, такія як шматкультурнасць і шматрэлігійнасць. Гэта праявілася ў артыкуле “Гродзенскія яўрэі ў XVIII ст.” [6], надрукаваным у каталіцкім выданні *Nowe życie*, што выходзіла пад рэдакцыяй ксяндза Людвік Саванеўскага.

Краязнаўчыя артыкулы на старонках гродзенскіх газет даюць вельмі шырокае ўяўленне пра стан даследаванняў у рэгіёне. Часам менавіта газеты з’яўляюцца адзінай крыніцай інфармацыі з артыкуламі. Так вядомы даследчык Гродна Юзаф Ядкоўскі на працягу 1920–1937 гг. змясціў больш за сорак артыкулаў на старонках такіх газет як *Echo Grodzieńskie, Nowe Życie, Nowy Dzienniky Kresowy* і інш.

Рэдактарамі і аўтарамі артыкулаў былі вядомыя ў Гродне і на Гродзеншчыне асобы: паэт, грамадскі дзеяч і заснавальнік Таварыства ім. Э.Ажэшкі – Станіслаў Земак, дырэктар музея і гісторык – Юзаф Ядкоўскі, ксёндз Людвік Саванеўскі, вайсковец і паэт – Адам Ковальскі, журналісты Антоні Патла і Стэфанія Носціж-Яцкоўская і інш.

Нягледзячы на вялікую колькасць выданняў у горадзе, паўстае пытанне наколькі яны былі запатрабаваныя сярод жыхароў. Пра тое, хто мог чытаць гродзенскую прэсу можна даведацца з лістоў, якія атрымоўвалі рэдакцыі газет і часта змяшчалі на старонках перыядычных выданняў. Лісты дасылалі з усёй Гродзеншчыны, а значыць геаграфічна выданні ахоплівалі досыць шырокія тэрыторыі. Канешне, не можна выключыць, што некаторыя лісты былі напісаны па замове рэдакцыі ці самімі рэдактарамі з мэтай распачаць дыскусію па нейкай праблеме. Пасля прагляду надрукаваных лістоў на старонках газеты *Dziennik Kresowy* за 1923 г. сярод аўтараў знаходзяцца: прозвішча прэзідэнта горада Эдварда Стэпнеўскага, дырэктара тэатра Браніслава Скопскага, уладальніка кнігарні Э. Іберскага, жыхара мястэчка Парэчча Алоіза Незгоды, дырэктара Дзяржаўнага аздараўленчага таварыства Марыяна Рампа і звычайных жыхароў. Лісты, атрыманыя ад апошніх, часцей падпісаны ініцыяламі ці ананімныя. З іх зместу вынікае, што яны былі напісаныя асобамі, якія звязаны з прамысловай дзейнасцю ці з інтэлектуальнымі коламі горада. Самі лісты апісвалі канкрэтныя праблемы – як тэхнічныя так і адміністрацыйныя ў функцыянаванні горада.

Прадпрыемствы Гродна былі зацікаўлены ў развіцці газет, у сувязі з магчымасцю змясціць на іх старонках сваю рэкламу. Таму лагічна, што чытачамі маглі быць і працаўнікі фабрык. У 1923 г. гродзенцы працавалі на чатырох фабрыках тытуневых вырабаў, якія ў 1924 г. былі выкуплены польскім урадам і стварылі адно вялікае прадпрыемства (існуе да сёняшняга дня) – Дзяржаўная фабрыка тытуневых вырабаў. Акрамя яго працу знаходзілі на керамічным прадпремстве, на фабрыцы ўпакоўкі, на тартаках, у гарбарні, броварах і паравых млынах, а таксама на вядомай фабрыцы ровараў і матацыклаў „Niemen” і інш. [5, с. 25]. Усе гэтыя вялікія і малыя прадпрыемствы змяшчалі на старонках газет сваю рэкламу.

Інтэлектуальнае жыццё горада было прадстаўлена ва ўласных выданнях таварыстваў. Напрыклад, дзейнасць Яўрэйскага краязнаўчага таварыства прадстаўлена на старонках часопіса *Krajoznawstwo* (выдавалася па-польску і на ідыш), якое выдаваў філіял арганізацыі ў Гродна ў 1930-х гадах. Пры гэтым варта адзначыць, што гэтае выданне было ўнікальным у Польшчы, падобныя выдавецкія ініцыятывы звычайна паўставалі ў межах усёй дзяржавы, а гэта асобнае выданне для канкрэтнага рэгіёна.

У 1920-х гадах паўсталі два музея ў Гродне – Дзяржаўны музей у Гродне і Гарадскі прыродазнаўчы музей, а таксама быў адчынены заапарк. Дзякуючы намаганням іх кіраўніцтва пачалі выдавацца гадавікі, як, напрыклад, *Muzeum w Grodnie*. Розныя справаздачы з іх дзейнасці часта з’яўляліся на старонках штодзённых газет ў форме даступнай для чытачоў. Менавіта, рэцэнзіі, змешчаныя пасля мерапрыемстваў і падзей на старонках штодзённых газет, якія з’яўляюцца незалежнымі ад арганізацый, з’яўляюцца крыніцай пра культурнае жыццё гараджан.

Яшчэ адной крыніцай паўставання новых выдаўнічых ініцыятыў з’яўляліся польскія адукацыйныя ўстановы. Так мужчынская гімназія імя Адама Міцкевіча выдавала часопіс *Znicz* з 1930 г., які рыхтавалі вучні гуртка аматараў літаратуры. У 1925 г. жаночая гімназія імя Эміліі Плятэр выдавала часопіс *Nad poziomy*. Пра гэтую актыўнасць вучняў таксама паведамлялі гарадскія газеты. Вялікае значэнне ў жыцці тагачаснай моладзі адыгрывала дзейнасць польскіх харцэраў, якія часта былі ініцыятарамі выдання аднадзёнак (выданняў у форме газет, якія выходзілі адзін раз), часцей яны друкаваліся ў сувязі з нацыяльнымі святамі.

У Гродне размяшчаўся 81 полк пяхоты імя Стэфана Баторыя, дзейнасць якога была прадстаўлена на старонках гродзенскіх газет. Афіцэры палка таксама прымалі ўдзел у выдавецкай справе. Дзякуючы ім з'явіўся, узгаданы вышэй, часопіс *Reduta.*

Такім чынам, жыхары Гродна ў 1918–1939 гг. стварылі шмат грамадскіх выдавецкіх ініцыятыў, якія карысталіся пэўным попытам. Існавала і свая група чытачоў, нягледзячы на тое што агульны ўзровень пісьменнасці ў усходніх ваяводствах Польшчы быў нізкі, часам толькі палова іх жыхароў магла чытаць.

Вялікая колькасць назваў газет сведчыць пра іх папулярнасць, а таксама ўкладаецца ў агульны працэс тагачаснага развіцця польскага перыядычнага друку. Газеты даюць нам магчымасць даследаваць штодзённае жыццё жыхара горада, пачынаючы ад яго звычайных чалавечых патрэбаў заканчваючы інтэлектуальнымі. А невялікая колькасць даследаванняў перыядычнага друку Заходняй Беларусі стварае шырокае поле для гісторыкаў і антраполагаў.


1. Казак, Т. Ушанаванне памяці Стэфана Баторыя ў Гродне ў міжваенны час / Казак Т. // Краязнаўчыя запіскі. – № 9. – Гродна : ЮрСаПрынт, 2013. – С. 124–131.
2. Historia Białegostoku. – Białystok: Funadacja Sąsiedzi, 2012. – 672 с.
3. Milewski, J. Stefan Batory w tradycji Grodna 1919–1939 / J. Milewski // Наш Радавод. – Гродна, 1999. – Кніга 8. – С. 462–468.
4. Notkowski, A. Polska prasa prowincjonalna Drugiej Rzeczypospolitej (1918–1939) / A. Notkowski. – Warszawa : Państ. Wydaw. Naukowe, 1982. – 638 с.
5. Rennikowa, W. Z dziejów Grodna / W. Rennikowa // Pamięć Grodna 1919–1939 Informator wystawy. – Warszawa 1999. – 99 с.
6. Żydzi grodzieńscy w XVIII wieku // Nowe życie. – Nr 3. – R.VII. – 13 stycznia 1924. – С 4.



**Мазур Л.Н., Горбачев О.В.**


## ВСЕРОССИЙСКАЯ ПАРТИЙНАЯ ПЕРЕПИСЬ 1922–1924 гг. КАК ИСТОЧНИК ПО ИСТОРИИ СЕМЬИ*

Одним из направлений исследования российской семьи в раннесоветский период является изучение влияния идеологических факторов на ее трансформацию, изменение структуры, функций и правовых основ. 1920-е гг. вошли в историю России как время активного реформирования семьи, в основе которого лежали, во-первых, объективные модернизационные факторы, обеспечивающие постепенный и закономерный переход семьи от традиционной к современной ее разновидности; а во-вторых, попытки социального конструирования института семьи в соответствии с коммунистическими идеями и представлениями о роли и месте семейной организации в обществе будущего. В результате комплексного влияния обоих факторов семейные процессы в СССР приобрели специфические черты – это ускоренная и не вполне естественная эмансипация женщин, а также перераспределение функций воспитания детей между семьей и государством на фоне сохранявшейся патриархальной структуры внутрисемейных отношений.

Несмотря на бесспорные достижения в изучении раннесоветской семьи, дискуссии исследователей о возможностях «радикального» преобразования семьи, а также задачах политики советского государства во многом остаются в теоретической плоскости, выводы не верифицируются статистически, тем самым без внимания остаются *реальные* изменения, которые происходили в семье. Справедливость многих положений может быть по дтверждена или оспорена с привлечением массовых источников. Среди них следует выделить Всесоюзную перепись населения 1926 г., но ее возможности в деле реконструкции истории семьи ограничены, поскольку она ориентирована на характеристику ее демографического статуса, а не социальных трансформаций. Кроме того, первичные бланки переписи населения и семейные карты практически не сохранились, исследователям доступны только агрегированные результаты, что затрудняет выделение и анализ конкретно-исторических типов семей.

В результате исследователь семьи вынужден обращаться к нетрадиционным источникам, к которым относятся материалы Всероссийской партийной переписи 1922 г. РКП(б) в то время не была массовой (на начало 1922 г.ее численность составляла 410 тыс. чел. при том, что в европейской части РСФСР по переписи 1920 г. проживало 65 млн. чел.)[7, с. 8]. Значимость источника определяется главным образом тем, что в партийной среде в первую очередь прояви-


* Тема исследования поддержана грантом Российского фонда фундаментальных исследований № 15-06-05611 «Типология раннесоветской семьи по материалам партийных переписей 1920-х гг.».





Репозиторий ВГУ